*Алег Трусаў*

# Археалагічнае вывучэнне Мірскага замка

Першыя раскопкі Мірскага замка ў 1912 годзе ажыццявіў **Язэп Ядкоўскі**. Ён зрабіў таксама грунтоўнае гісторыка-архітэктурнае апісанне і замалёўкі замкавага комплексу. Даследчык на падставе археалагічных знаходак выказаў некаторыя цікавыя меркаванні, якія потым пацвердзіліся і іншымі даследаваннямі. Так, ён знайшоў кавалкі каляровага шкла таўшчынёй да 5 мм і датаваў іх XVI ст. У XVII ст., на яго думку, звычай рабіць вітражныя вокны змяніўся на "новае шкленне вокнаў". Печы ў замку спачатку былі асаблівымі, складзенымі з кафлі з малюнкамі "з каляровай глазурай". Відаць, мелася на ўвазе паліхромная кафля. У XVII – пачатку XVIII ст. пасля шведскіх нашэсцяў старыя печы разабралі і склалі новыя з зялёнай кафлі. Аднак два каміны былі з "залачонымі кафлянамі". Ядкоўскі адзначаў, што замак быў цалкам накрыты лускавай дахоўкай. Каля палаца з поўначы на поўдзень была выкапана траншэя, але рэшткаў пабудоў не знайшлі. Каля галоўнай брамы быў знойдзены калодзеж[1].

Наступным даследчыкам замка быў **Міхась Ткачоў**. У 1972 г. ён часткова раскапаў рэшткі ўмацавання перад галоўнай уязной брамай-вежай, якія яшчэ ў XIX ст. захоўваліся на паверхні зямлі і былі вядомы праз малюнкі і апісанні. У плане — гэта падкова-падобная цагляная сцяна таўшчынёй 1,25 м. Рэшткі гэтага мура захаваліся тады на вышыні месцамі да 1,35 м.[2] Спачатку ён датаваў гэтую пабудову не пазней сярэдзіны XVI ст., але пасля пагадзіўся з дацыроўкай В. Калніна і Л. Трэнет, а менавіта: канец XVI – пачатак

1 Иодковский И. И. Замок в Мире // Древности. — М., 1915. — Т. 6. — С. 19–20.

2 Ткачев М. Н. Исследования в Гродненской и Витебской областях // Археологические открытия 1972 года. — М., 1973. — С. 369.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

XVII ст.[3] У жніўні 1991 года прадбрам'е было цалкам раскапана і вывучана аўтарам артыкула.

Аўтар артыкула даследаваў Мірскі замак пачынаючы з 1980 года (1980–1984 і 1988–1991). Галоўная мэта раскопак — максімальна магчымае даследаванне культурнага пласта, які мог быць знішчаны падчас рэстаўрацыйных работ.

Другая задача — збор і аналіз рознага археалагічнага матэрыялу для рэканструкцыі старажытных інтэр'ераў палаца, канструкцыі дахаў сцен і вежаў. У выніку даследаванняў было адкрыта 5050 м² культурнага слоя, знойдзена шмат унікальных знаходак.

Было высветлена, што на месцы будучага будаўніцтва замка існавала больш ранняе паселішча XV ст. Знойдзены развал глінабітнай печы, складзенай з гаршковай кафлі. Знаходкі кавалка шпоры, аконнага шкла і керамікі другой паловы XV ст. сведчаць аб тым, што тут мог знаходзіцца феадальны двор, альбо баярская сядзіба. Паселішча загінула ў выніку моцнага пажара, пра што сведчыць вялікая колькасць вуголля. У пачатку XVI ст. будаўнікі на гэтым месцы зрабілі насып з гліны, пяску і каменняў і забудавалі шматвежавы мураваны замак.

Знойдзеныя знаходкі часоў існавання замка можна падзяліць на тры этапы.

Да першага (першая палова – сярэдзіна XVI ст.) адносяцца знаходкі часоў панавання князёў Іллінічаў. Гэта, у асноўным, будаўнічыя матэрыялы (цэгла, дахоўка), крыху гаршковай і каробкавай кафлі і кухоннага посуду.

Да другога этапу (другая палова – канец XVI–XVIII ст.) адносіцца асноўная маса знаходак. Гэта час, калі замкам валодалі Радзівілы. Прычым, пераважная колькасць знаходак гэтага перыяду датуецца канцом XVI – першай паловай XVII ст., часам найбольшага росквіту замкавага жыцця.

Трэці этап (канец XIX – першая палова XX ст.) звязаны з жыццём і дзейнасцю князёў Святаполк-Мірскіх — апошніх гаспадароў замка. Аднак знаходак гэтага часу няшмат, і гэта, у асноўным, будаўнічыя матэрыялы.

---

3 Калнін В. В., Трэнет Л. В. Мірскі замак // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1975. — № 1. — С. 31; Ткачев М. А. Замки Белоруссии. — Мн., 1987. — С. 152.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Трэба адзначыць, што падрабязную інфармацыю пра раскопкі Мірскага замка і самога Міра можна атрымаць з калектыўнай манаграфіі Ніны Здановіч, Алеся Краўцэвіча і Алега Трусава[4]. Асобныя знаходкі з гэтых раскопак шмат разоў друкаваліся ў розных энцыклапедыях, даведніках, манаграфіях і навукова-папулярных выданнях, нават трапілі на грашовую купюру Рэспублікі Беларусь вартасцю 50000 рублёў.



**Мал. 1**



**Мал. 2**

РЕПОЗИТОРИЙ

4 Здановіч Н. І., Краўцэвіч А. К., Трусаў А. А. Матэрыяльная культура Міра і Мірскага замка. — Мн., 1994. —152 с.